# ВОБРАЗ ТОМАША Ў РАМАНЕ «НЕВЫНОСНАЯ ЛЁГКАСЦЬ БЫЦЦЯ» М. КУНДЭРЫ ПРАЗ ПРЫЗМУ ПСІХААНАЛІТЫЧНЫХ КАНЦЭПЦЫЙ З. ФРЭЙДА І К. Г. ЮНГА

**А. А. Шадруноў**

*aleh.shadrunou@icloud.com;*
*Навуковы кіраўнік – А. У. Вострыкава, кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

М. Кундэра ў сваім рамане дэманструе прысутнасць філасофскага складніку, які ўплывае на ідэйна-тэматычны пласт і канцэпцыю вобразаў. У дакладзе мы падрабязна аналізуем прысутнасць і ўплыў псіхааналітычнай філасофіі на мастацкі свет самага папулярнага рамана чэшскага пісьменніка «Невыносная легкасць быцця». Асноўная ўвага намі сканцэнтравана на вобразе Томаша, які разглядаецца праз прызму канцэпцый З. Фрэйда і К. Г. Юнга.

***Ключавыя словы:*** раман М. Кундэры «Невыносная лёгкасць быцця», вобраз Томаша, псіхааналіз у літаратуразнаўстве, архетыпы.

У рамане Мілана Кундэры «Невыносная лёгкасць быцця» можна заўва-жыць ўсюдыісную прысутнасць псіхааналітычнай філасофіі і розных аспектаў тэорый слынных дзеячоў псіхааналізу – З. Фрэйда, К. Г. Юнга. Няма сумневу, што пісьменнік у працэсе задумы і напісання твора звяртаўся да кніг вядомых філосафаў, чые працы былі адной з ключавых частак заходняй культуры XX стагоддзя. Мы можам пераканацца ў яго цікавасці да псіхааналізу, дэталёва прасачыўшы вобразы чатырох галоўных герояў – Томаша, Тэрэзы, Сабіны і Франца. У самім сюжэце мы пабачым невялікі экскурс у мінулае таго ці іншага персанажа, а таксама аскепкі інфармацыі, якія дазваляюць нам інтэрпрэтаваць іх паводзіны з гледзішча псіхааналітычнай філасофіі (канцэптаў бессвядомага, снабачанняў і архетыпаў).

Каб падмацаваць свае папярэднія сцверджанні, а таксама прэзентаваць матэрыял для аналізу, мы прывядзём некаторыя цытаты з рамана, якія будуць выдатнымі ілюстрацыямі ўздзеяння псіхааналітычнай філасофіі на асноўную думку, сюжэт твора і канцэпцыю вобразаў М. Кундэры.

*«И снова подумалось, что Тереза ребенок, которого положили в просмоленную корзинку и пустили по течению. Но можно ли позволить кор-зинке с ребенком плыть по бушующей реке?»* [1, с. 15]

Вобраз немаўляці ў кашы, што быў пушчаны па рэчцы і прыбіўся да берага, на якім яго ўжо чакаў будучы апякун, вельмі хрэстаматыйны. Ён сустракаецца ў шмат якіх народаў свету і належыць да вельмі пашыраных легендарных сюжэтаў. Гэтыя акалічнасці дазваляюць

аднесці дадзены вобраз да сімвалаў, якія нараджаюцца, паводле К. Г. Юнга, з архетыпаў.

Але перад тым як гэта зробім, неабходна патлумачыць, у чым розніца паміж архетыпам і сімвалам. Сімвал – гэта канкрэтная праява архетыпа, дапасаванне яго да канкрэтных індывідуальных прыкладаў. Архетып жа – «ўніверсальная мадэль псіхічнай актыўнасці, якая спантанна вызначае паводзіны чалавека» [3, с. 50–51]. Архетыпы бяруць пачатак з калектыўнага бессвядомага, а не засвойваюцца з культурай.

Такім чынам, калі браць канцэпцыі К. Г. Юнга, вобраз дзіцяці ў кашы на беразе рэчкі з'яўляецца архетыпічным сімвалам. Але ж да якога архе-тыпу ён належыць? К. Г. Юнг адзначаў існаванне неабмежаванай колькасці архетыпаў у бессвядомым. Апрача самых вядомых – *Анімы, Анімуса, Самасці, Персоны* і *Цені,* – даследчык успамінаў і пра архетып *Дзіцяці* [3, с. 352]. Так, мы мяркуем, што тут можна гаварыць пра архетып Дзіцяці і яго перапляценне з іншымі катэгорыямі. Гледзячы на Тэрэзу і атаясамляючы яе з міфалагічным вобразам, Томаш падсвядома імкнецца абараніць гэтае дзіця, бо бессвядомае асацыюе яго з сабой маленькім, якому таксама не хапала любові бацькоў.

Цяпер жа пяройдзем да іншай цытаты далей па тэксце:

*Он жил с женой менее двух лет и произвел с ней на свет одного ребенка. На бракоразводном процессе суд присудил ребенка матери, а Томаша обязал платить на него треть своего заработка. При этом гарантировал ему право видеть сына каждое второе воскресенье»* [1, с. 15].

Шлюб Томаша з яго першай жонкай быў вельмі непрадуманым і хісткім і ўзнік толькі праз нараджэнне дзіцяці (мы можам зрабіць такія высновы з далейшага фрагменту тэксту, дзе Томаш прызнае, што дзіця было нежаданае: *«Почему, впрочем, он должен был испытывать к этому ребенку, с которым его не связывало ничего, кроме одной неосмотрительной ночи, нечто большее, чем к любому другому?»* [1, там жа]).

Пасля растання з жонкай Томаш імкнуўся сустракацца з сынам, але, стаміўшыся ад пастаянных адмоў у сустрэчах, вырашыў, *«что уже никог-да в жизни не пожелает его [сына] видеть»* [1, там жа].

Томаш апраўдаў свае паводзіны нежаданасцю гэтага дзіцяці. Відавоч-на, што такі ўчынак не быў нармальна прыняты блізкімі, таму яго бацькі перасталі з ім камунікаваць, але *«при этом они остались в демонстративно хороших отношениях с невесткой и похвалялись всем и вся своим примерным поведением и чувством справедливости»* [1, с. 16].

М. Кундэра заўважае, што Томаш у такі кароткі прамежак часу пазбавіўся жонкі, сына, маці і бацькі. Гэтая сітуацыя пакінула ў ім толькі страх перад жанчынамі, кіруючыся каторым, Томаш выпрацаваў сістэму правіл, якія дапамогуць больш ніколі не закахацца:

*«Между страхом и желанием ему пришлось создать некий компромисс; он определял его словами "эротическая дружба". Он убеждал сво-их любовниц: лишь те отношения, при которых нет ни следа сентимен-тальности и ни один из партнеров не посягает на жизнь и свободу друго-го, могут принести обоим счастье. И желая заручиться уверенностью, что так называемая эротическая дружба никогда не перерастет в агрессивность любви, он встречался с каждой из своих постоянных любовниц лишь после весьма длительных перерывов»* [1, там жа].

Такім чынам, апісаная ў вышэйшых цытатах сітуацыя вельмі моцна паўплывала на нашага героя. Пазіцыя бацькоў, якія выбралі замест яго нявестку і ўнука, вельмі яго закранула і выклікала своеасаблівую боязь перад каханнем, што пералілася ў пэўныя табу, якія нібы на сваю карысць ён сам ўсталяваў і зацвердзіў. Так, герой не прымае сна ўначы ў адным ложку з жанчынай, бо гэта асацыюецца ў яго з каханнем. Са з'яўленнем Тэрэзы герой пераглядае гэту пазіцыю, але працягвае весці палігамны лад жыцця, што, вядома, выклікае Тэрэзіны пакуты, якія ён не можа спыніць.

З гледзішча псіхааналітычных канцэпцый і перадусім прац З.Фрэйда, такія дагматычныя перакананні сведчаць пра дзіцячую траўму, нягледзя-чы на тое, што ўзніклі яны ўжо ў сталым узросце. Гэта можна патлума-чыць тым, што прыхаваны перыяд траўмы трываў ад дзяцінства аж да таго моманту, як яго жыццё разбурылася праз жонку.

Тут жа і нагадалі пра сябе падзеі, што адбыліся ў дзяцінстве і хаваліся недзе глыбока ў бессвядомым. Аўтар не закранае наўпрост дзяцінства То-маша, але з ускосных сведчанняў (напрыклад, хаця б з таго, што яго бацькі былі на баку нявесткі – здрадзілі свайму сыну і не хацелі нават яго слухаць) можна зрабіць высновы, што гэта – іх адмысловы патэрн паво-дзін, які яны не змянялі з дзяцінства Томаша. Гэта акурат і магло прывесці да такой псіхалагічнай траўмы.

Наш герой – нарцысічная асоба, якая стараецца кампенсаваць нанова адкрытую траўму. Гэта відаць па яго рэакцыі на расстанне з роднымі (нашым героем перасталі захапляцца, не аднесліся да яго як мае быць, таму ён пачуў крыўду і не хоча больш ісці на кантакт). Характэрна таксама, як Томаш адрэагаваў на сына, калі яны нарэшце сустрэліся: ён заўважыў, што сын аднолькава з ім крывіць вусны, што нашаму персанажу вельмі не спадабалася, хаця ён і не ведае чаму

(бессвядомае выказала, што толькі адзіны непаўторны Томаш можа мець такую рысу) [1, с. 176]. Урэшце, усе яго стасункі з вялікай колькасцю жанчын адначасова і свядомая немагчымасць адмовіцца ад гэтага на карысць Тэрэзы, як піша М. Кундэра, праз яго імпэт да «калекцыянавання адной мільённай долі адрозненняў жан-чын паміж сабой» [1, с. 168], як мага лепш даказваюць нашую тэорыю. Пры гэтым жа яму нішто не перашкаджала рэўнаваць Тэрэзу да нейкага калегі, які згадзіўся з ёй патанцаваць [1, с. 20] – чым такі эгаізм, надзяленне сябе большымі «паўнамоцтвамі» ў стасунках можа тлумачыцца інакш?

Можна было б прыводзіць яшчэ шмат матэрыялу з твора, але мы пакуль што спынемся на вышэй пададзеных цытатах і паспрабуем асэнсаваць сутнасць герояў. Усе персанажы, у тым ліку разгляданы намі Томаш, паказаныя ў рамане траўмаванымі людзьмі. Прычым гэтыя псіхалагічныя траўмы, атрыманыя яшчэ ў дзяцінстве, нагадваюць пра сябе і вызначаюць іх мадэль паводзін і канкрэтныя ўчынкі. Так, ніводзін з герояў не змог збу-даваць нармальных партнёрскіх стасункаў, псіхалагічна здаровай сям'і ці сяброўскіх адносін. Усе гэтыя формы камунікацыі паміж людзьмі разбураліся праз пэўныя псіхалагічныя рамкі, якія нашыя героі самі сабе паста-вілі.

Такім чынам, мы можам сцвярджаць пра ўплыў псіхааналітычных канцэпцый на вобразную і ідэйную сістэму ў рамане чэшскага творцы.

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Кундера М.* Невыносимая легкость бытия. Санкт-Петербург : Азбука-классика, 2009.
2. *Юнг К. Г.* Архетипы и коллективное бессознательное. Санкт-Петербург : АСТ, 2020.
3. *Юнг К. Г.* Божественный ребенок : Аналитическая психология и воспитание : сб. М. : Олимп: ООО «Издательство АСТ-ЛТД», 1997.
4. *Фурс В.* Н. Архетип // Всемирная энциклопедия: Философия XX век / гл. науч. ред. и сост. А. А. Грицанов. М. : АСТ ; Минск : Харвест : Современный литератор, 2002. С. 50–51.